– Я вучыўся як кампазітар, але не магу сябе лічыць ім.

*– З якімі кампазітарамі і музыкантамі супрацоўнічае канал «Культура»?*

– З кампазітарам Аляксандрам Літвіноўскім, які працуе на канале і займаўся музычным афармленнем праграм.

*– Якія музычныя праекты «Культуры», на ваш погляд, самыя знакавыя і заслужылі асаблівую любоў радыёслухачоў?*

– Складана кагосьці вылучаць, бо ўсе праграмы канала цікавыя і адметныя. Часам хочацца паслухаць рэтра-музыку, часам джаз альбо размову з госцем.

*– Вашы пажаданні у год юбілею канала калектыву і сабе.*

– Жадаю ўсім натхнёнай працы і асалоды ад зробленага!

## «КАНАЛ “КУЛЬТУРА” – РАБОТА ПА ДУШЫ»: СВЯТЛАНА КОЛМАК

**Т. У. Малмыга**
**Г. Г. Чарняўская**, студэнтка 1 курса
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

*– Святлана Мікалаеўна, як вы прыйшлі на канал «Культура»?*

– Маё супрацоўніцтва з Беларускім радыё пачалося ў 1997 годзе, калі студэнткай факультэта журналістыкі БДУ, я прыйшла на вытворчую практыку ў рэдакцыю 2-ой праграмы Беларускага радыё – «Радыё-2». З 2002-га – я ў штаце канала «Культура».

Добра памятаю, як Кацярына Іванаўна Агеева, першы дырэктар «Культуры», стварала канал з чыстага ліста. Сапраўды быў цікавы час, але і складаны. Кацярына Іванаўна звярталася да кожнага супрацоўніка, з кім жадала працягнуць працу, і разам шукалі магчымасці для сумеснай творчай рэалізацыі. Так было і са мной. Яна прапанавала займацца інфармацыйным вяшчаннем. У выніку, у нас склалася, як мне падаецца, самая лепшая інфармацыйная служба, якую ўзначаліла ў той час Вольга Гальпяровіч.

*– Ці памятаеце вы свой першы выхад у эфір на канале «Культура»?*

– Свой першы эфір на канале «Культура» я памятаю добра. Гэта быў, мабыць, трэці дзень вяшчання канала. Мы з калегамі сабраліся

ў студыі, каб павіншаваць у эфіры з днём нараджэння нейкага творцу. І кожнаму з нас трэба было сказаць літаральна некалькі слоў. Калі дайшла чарга да мяне, я зразумела, што дыхання не хапае, каб вымавіць і слова. Але ж сабралася і ўсё атрымалася…

*– Якія свае праекты вы лічыце самымі ўдалымі?*

– Наш дырэктар, Кацярына Іванаўна Агеева, заўсёды ішла насустрач кожнаму супрацоўніку, яна ўважліва ставілася да нашых інтарэсаў і захапленняў. Акрамя інфармацыйнага вяшчання, мяне, канечне ж, цягнула да іншых тэм. Літаральна ў першы год вяшчання канала «Культура» ў эфіры з’явіўся мой музычны праект – «Рэтра-хіт». Задача была – пазнаёміць слухачоў з паўзабытымі і маловядомымі песнямі айчыннай і замежнай эстрады. Асабліва цікава мне было працаваць са стужкамі мінулых гадоў, якія захоўвае фанатэка Дома радыё. А дапамагала мне разабрацца ў багатай калекцыі радыйных фондаў – найстарэйшы работнік Беларускага радыё, музычны рэдактар Валянціна Паўлаўна Прыбава. Праграма «Рэтра-хіт» – доўгажыхарка, пачуць яе можна і сёння па нядзелях. Канцэпцыя перадачы не змянілася, па-ранейшаму яна складаецца выключна з заявак слухачоў.

*– Што ў працы вам падабаецца больш за ўсё?*

– Сустрэчы з цікавымі людзьмі. У нас не можа быць «дня сурка». Кожны эфір не падобны на папярэдні. Іншым разам выходзіш пасля праграмы і адчуваеш сябе шчаслівым чалавекам! Госці ратуюць нас ад дрэннага настрою, дэпрэсій, нават ад нейкіх асабістых клопатаў, пра якія ты забываеш адразу. І, канечне ж, прамыя эфіры! Без іх радыйшчыку жыць складана. А калі яшчэ ёсць магчымасць у прамым эфіры паразмаўляць са слухачамі – вось сапраўднае шчасце!

*– Вы былі аўтарам і вядучай праграмы «Па-за іміджам». Каго з вядомых творчых асоб вы запрашалі на перадачу і якая сустрэча вам запомнілася найбольш?*

– Менавіта, каб сустракацца з цікавымі суразмоўцамі ў студыі канала «Культура» і была задумана праграма «Па-за іміджам». Мы знаёмілі слухачоў з унутраным светам вядомых у краіне людзей: зорак эстрады, шоумэнаў, спартсменаў, модных літаратараў або мастакоў, папулярных акцёраў, тэлевядучых – тых, пра каго «ўсе гавораць». Мэта праекта – паказаць, што за іміджам, напрыклад, эпатажнай «свецкай ільвіцы» можа хавацца клапатлівая матуля, а

папулярны спявак, кумір тынэйджараў, па выхадных ездзіць на сваёй крутой машыне да матулі ў вёску дапамагчы шчапаць дровы і г. д. Гасцей было шмат, а запомніла я свайго першага суразмоўцу – 70-гадовага ды-джэя Казіміра. Харызматычны і вясёлы дзядуля, добра знаёмы многім жыхарам сталіцы. Яго можна ўбачыць на кожным гарадскім свяце, заўсёды яркі і арыгінальны стыляга, вядомы рыфмаплёт. Дзед Казімір заўсёды любіў эпаціраваць публіку, а ў той год вырашыў стаць модным ды-джэем. І ў яго атрымалася. Вось пра свае гастролі і выступленні ў начных клубах ён расказваў. І як далучаў моладзь да рэтра-музыкі.

*– Што самае складанае ў рабоце на канале «Культура»?*

– Я нават і не ведаю, што самае складанае ў маёй працы. Я магу толькі адказаць адно: калі твая справа па душы – складанасцей ніякіх не існуе.

*– Што вы хацелі пажадаць каналу і яго супрацоўнікам у юбілейны год?*

– Хачу павіншаваць канал «Культура» з 20-годдзем. Дзякую лёсу, які звёў мяне на творчым шляху з маімі калегамі. Памятаю кожнага! Дзякую суразмоўцам, што робяць маё жыццё і, спадзяюся, жыццё радыёслухачоў цікавым і вясёлым. Дзякую нашым радыёслухачам! І лічу, што яны ў «Культуры» самыя інтэлігентныя, тактычныя і разумныя. Жадаю каналу здаровага ўнутранага духу, каб у эфір ліліся цікавыя і жыццясцвярджальныя праграмы, а супрацоўнікам і слухачам радыёстанцыі – атрымліваць асалоду ад кожнага эфірнага гука і заставацца на адной хвалі – хвалі канала «Культура»!